# *Утварэнне і правапіс прыслоўяў

Урок у 7 класе

1. Разам
2. Праз злучок
3. Асобна

# *<u>Р а з а м</u> пішуцца:

* 1. ***П р ы с л о ў і***, утвораныя спалучэннем ***п р ы н а з о ў н і к а ў з с а м а с т о й н ы м і ч а с ц і н а м і м о в ы:***
* ***1)*** з прыслоўямі: *назаўтра, паслязаўтра, пазаўчора, залетась, замала, залішне, насупраць, назаўсёды, дацямна*

* 2) з лічэбнікамі: *натрае*, *утрох*, *утраіх*, *утрая* і інш. (але: *па двое*; *у адно*);

* 3) з займеннікамі: *потым*, *нашто*, *нізашто*, *навошта*

* 4) з кароткімі і поўнымі прыметнікамі: *злева, управа, налева, зрэдку, збольшага, здалёку, пароўну, падоўгу, дачыста, ушчыльную, упустую, унічыю, наўдалую* (але: *у адкрытую; на міравую; на бакавую*);

* 5) з назоўнікамі:
* а) якія без прыназоўніка не ўжываюцца: *дарэшты*, *дашчэнту*, *даспадобы*, *употай*, *знячэўку*, *няўцям*, *спакон*, *бесперастанку*, *безупынку* ( і *без упынку*);
* б) паміж якімі нельга ўставіць азначэнне ці склонавае пытанне: *напалову*, *навекі*, *напаказ*, *навобмацак*, *назло*, *напралом*, *наадрэз*, *нацянькі*, *папраўдзе* (і *па праўдзе*), *спадылба*, *даволі*, *дахаты*, *дадому*, *углыб*, *усур'ёз*;

* в) якія маюць шырокае прасторавае і часавае значэнне: *звечара*, *увечары* (але: *пад вечар*), *зранку*, *удзень*, *уночы*, *апоўначы*, *спераду*, *збоку*, *ззаду*, *знізу*, *уверх*, *удалячынь*, *адразу*, *увысь*, *увосень*, *узімку*.

* **2. С к л а д а н ы я прыслоўі** — спалучэнні са словамі ***што*** і ***сама***: *штотыднёва*, *штодзень*, *штодзённа*, *штоночы*, *штовечар*, *штолета*; *гэтаксама*, *тамсама*, *таксама*.

# *Праз злучок

* 1) з прыстаўкай ***па-*** і суфіксамі ***-аму, -яму,-ому, -му, -ск-у, -цк-у, -ы, -ое, -ае, -яе***: *па-казённаму, па-іхняму, па-другому, па-мойму, па-казахску, па-купецку, па-воўчы, па-першае, па-другое, па-трэцяе;*
* 2) з прыстаўкай ***абы-***: *абы-дзе, абы-як, абы-куды;*

* 3) з постфіксам ***-небудзь***: *дзе-небудзь, як-небудзь, куды-небудзь;*
* 4) утвораныя паўтарэннем таго самага слова ці сінанімічных, антанімічных: *ціха-ціха, сам-насам, дзе-нідзе, перш-наперш, раз-пораз, воляй-няволяй, калі-нікалі, век-вяком.*

# * Асобна

* 1) спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі ***без***, ***да***, ***на***, ***з***: *без промаху, без агляднкі, без толку, без канца; да адвалу, да ўпаду, да смерці, да зарэзу; на адзіноце, на жаль, на хаду, на ляту, на бягу, на віду; з разбегу, з размаху, з разгону, з ходу, з налёту;*

* 2) спалучэнні, у якіх назоўнік можа ўжывацца **ў розных склонах:**
* *у час — у часе, з часам, да часу; на памяць — за памяццю, па памяці; пад пахай — па пахі, пад паху; за пазухай — за пазуху; пад рукой — пад руку, з-пад рукі;*

* 3) спалучэнні адмоўяў ***не***, ***ні*** з назоўнікам і прыназоўнікам: *не ў пару, не ў час, не ў меру, не да смеху; ні на грош, ні за грош;*
* 4) спалучэнні прыназоўніка **у** з назоўнікам, якія пачынаецца **з галоснага:** *у абдымку, у адзіночку, у абрэз, у абмен, у абхват;*

* 5) **устойлівыя спалучэнні:** *без дай прычыны*, *усё роўна*, *усё адно*, *як след* (але: *якраз*), *па праўдзе кажучы*, *час ад часу*, *з веку ў век*, *як на зло* (= ’*як на злосць*’).